УДК 73.04:94"1410"

# «ГРУНВАЛЬД» У МАСТАЦТВЕ

**Камісарук С. М.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Перамога пад Грунвальдам аказала вызначальны ўплыў на гісторыю дзяржаў-спадкаемцаў Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага – Беларусі, Польшчы, Літвы і Украіны. Яна мела настолькі важнае значэнне, што атрымала адлюстраванне ў шматлікіх творах мастацтва. У сваю чаргу, прысвечаныя Грунвальду творы сталі выдатнымі гістарычнымі падзеямі [1].

Аб'ектам дадзенага даследавання вызначаюцца мастацкія творы 15-21 ст., якія ўвасабляюць тэму Грунвальдскай бітвы, прадметам даследавання – стварэнне іканаграфічнай гісторыі гэтага ўвасаблення. У такой фармуліроўцы праблема не атрымала разгляду ў айчыннай і замежнай навуцы. У асноўным сустракаюцца не іканаграфіі, а аналіз творчасці асобных мастакоў, стылістычных накірункаў, гісторыка-культурных перыядаў [2, 3, 4].

На падставе праведзенага даследавання былі выяўлены наступныя творы мастацтва, прысвечаныя Грунвальдскай бітве:

1. Гравюра невядомага мастака «Бітва пад Таненбергам» з хронікі Д. Шылінга, створана ў Берне ў 1483 г., захоўваецца ў Гарадской бібліятэцы ў Берне.

2. Гравюра невядомага мастака «Грунвальдская бітва» з «Польскай хронікі» М. Бельскага, створана ў Кракаве ў 1597 г., захоўваецца ў Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі.

3. Палатно Януарыя Сухадольскага «Пасля Грунвальдскай бітвы», створана ў Варшаве ў 1850-х гг., месцазнаходжанне невядома.

4. Палатно Фелікса Сыпнеўскага «Бітва пад Грунвальдам», створана ў Варшаве ў 1862 г., захоўваецца ў Нацыянальным музеі ў Варшаве.

5. Палатно Яна Матэйкі «Бітва пад Грунвальдам», створана ў Кракаве ў 1875-1878 гг., захоўваецца ў Нацыянальным музеі ў Варшаве.

6. Палатно Зігмунда Развадоўскага і Тадэвуша Попела «Бітва пад Грунвальдам», створана ў Кракаве ў 1910 г., захоўваецца ў Львоўскім гістарычным музеі.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

7. Палатно Альфонса Мухі «Пасля Грунвальдскай бітвы», створана ў Празе ў 1924 г., захоўваецца ў Музеі замка Мараўскі Крумлаў.

8. Палатно Войцеха Косака «Грунвальд», створана ў Варшаве ў 1931 г., захоўваецца ў Музеі Войска Польскага ў Варшаве.

9. Палатно Гаўрылы Вашчанкі «Грунвальдская бітва», створана ў Мінску ў 1985 г., захоўваецца ў Гродзенскім дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі.

10. Палатно Стэфана Герватоўскага «Грунвальдская бітва», створана ў Варшаве ў 1987 г., захоўваецца ў Музеі Войска Польскага ў Варшаве.

11. Палатно Шарунаса Саўкі «Бітва пад Таненбергам», створана ў Літве ў 1987 г., захоўваецца ў прыватнай калекцыі.

12. Гравюра Міхаіла Басалыгі «Грунвальдская бітва», створана ў Мінску ў 1989 г., захоўваецца ў Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі.

13. Акварэль Паўла Татарнікава «На грунвальдскім полі», створана ў Мінску ў 2008-2009 гг., уласнасць аўтара.

Праведзенае даследаванне дазволіла зрабіць высновы, што ў прысвечаных Грунвальдскай бітве творах увасоблена гістарычнае развіццё мастацкай культуры на працягу 6 стагоддзяў. У іх знайшлі адлюстраванне як агульнаеўрапейскія эстэтычныя ідэі, так і адметнасці нацыянальнай культуры. Агульным для ўсіх твораў з'яўляецца міфалагізаванае ўвасабленне гістарычнай падзеі. Гэта тлумачыцца самой сутнасцю мастацтва: паколькі гісторыя з'яўляецца інтэрпрэтацыяй фактаў, то гістарычнае мастацтва становіцца «інтэрпрэтацыяй інтэрпрэтацый», – адначасова гістарычна абумоўленай і вельмі асобаснай.

Гісторыя культуры Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага вызначалася развіццем моцна еўрапеізаванага і ў той жа час самабытнага мастацтва. Уласцівыя еўрапейскаму мастацтву рысы сінтэзаваліся з мясцовай традыцыяй, дзякуючы чаму фарміраваліся спецыфічныя мастацкія якасці: па-першае, на развіццё мастацтва ўплывалі дзяржаўныя, палітычныя, саслоўныя асаблівасці гісторыі; па-другое, мастацтва выконвала шэраг пазаэстэтычных функцый. У пэўныя гісторыка-культурныя перыяды пераважалі асаблівыя сацыякультурныя функцыі: у эпоху Адраджэння – дакументальна-інфармацыйная і светапоглядна-ідэалагічная, Новага часу – выхаваўча-патрыятычная і грамадска-пераўтваральная, Найноўшага часу – экзістэнцыяльная і эстэтычная.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

**ЛІТАРАТУРА**
1. Сагановіч, Г. Грунвальд у беларускай гісторыі: Спроба разбору палітычнага міфа / Г. Сагановіч.– Мінск : Медысонт, 2015.– 416 с.
2. Лазука, Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва. У 2 т. Т. ІІ. XVIII – пачатак XXI ст. / Б. А. Лазука. – Мінск: Беларусь, 2007. – 350 с.
3. Suchodolski, M. Polska. Naród a sztuka / M. Suchodolski, B. Suchodolska. – Warszawa: Arkady, 1988. – 472 s.
4. Добровольский, Т. История польской живописи / Т. Добровольский. – Варшава: Ossolineum, 1975. – 261 с.

УДК 371.3

# АКТИВИЗАЦИЯ ПОЗНАВАТЕЛЬНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ОБУЧАЮЩИХСЯ

**Коваленко А. Ф., Горустович Т. Г.**
УО «Белорусский государственный аграрный технический университет»
г. Минск, Республика Беларусь

В процессе приобретения учащимися знаний, умений и навыков важное место занимает их познавательная активность, умение учителя активно руководить ею невозможно без активной речевой деятельности. Результативность обучения напрямую зависит от степени активности учащегося в этом процессе. Познавательная активность как качество деятельности ученика, которое проявляется в его отношении к содержанию и процессу учения, в стремлении к эффективному овладению знаниями и способами деятельности за оптимальное время, в мобилизации нравственно-волевых усилий на достижение учебно-познавательной цели. Данное определение подразумевает не только процесс, но и результат обучения, освоение средств, способствующих наиболее действенному учению, учитывает эмоциональную сторону учения. И. Ф. Харламов считает, что познавательная активность – «деятельностное состояние ученика, которое характеризуется стремлением к учению, умственному напряжению и проявлению волевых усилий в процессе овладения знаниями». Следовательно, основными признаками познавательной активности являются проявление желания к познанию, активный процесс узнавания новых фактов, отношение к обучению как к чему-то ценному, привлекательному и, значит, интересному, предполагает высокую степень проявления самостоятельности, направлена на вовлечение ученика в творческую деятельность. В учебном процессе

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ